ЗГОДА

ІНФАРМАЦЫЙНА-АНАЛІТЫЧНЫ ШТОТЫДНЁВІК
http://www.zgoda-weekly.org

№ 36 (264) 11 кастрычніка — 18 кастрычніка 2002 г.

КРЕСТОВЫЙ ПОХОД

НИ СВОБОДЫ, НИ СОВЕСТИ

АНАСТАСИЯ ПЕТРОВСКАЯ

Совет республики 2 октября поддержал новую версию закона «О свободе вероисповеданий и религиозных организациях». То, о чем так долго мечтали большевики, свершилось. Вместо одной на всех партии в Беларуси вводится единство веры. Под видом борьбы с «*неокультами и деструктивными сектами*» за Русской православной церковью назначена определяющая роль. А вот представители иных конфессий и религий («*нетрадиционных*» уже по закону) всерьез опасаются, что свою деятельность им отныне придется осуществлять подпольно.



НАШ ВЕРНИСАЖ. «Палатная Голгофа», художник АЛЕКСАНДР СДВИЖКОВ-ДАНЦИГ-ДАЛИ

Исполнительный директор Международной Хельсинкской федерации Аарон Роудс охарактеризовал принятый белорусскими сенаторами документ как «*закон против свободы вероисповедания*».

Негативную оценку сему шедевру парламентского творчества выдали и другие влиятельные международные структуры. Например, еще тогда, когда поправки находились на рассмотрении в парламенте, посольство США в Беларуси распространило заявление, где говорилось: «*Складывается впечатление, что цель законопроекта — помешать деятельности религиозных групп, которые белорусское правительство посчитает принадлежащими к «нетрадиционным» конфессиям, что противоречит международным принципам религиозной свободы и прав человека*».

О том, что поправки в закон о свободе совести ущемляют права верующих, много и громко говорилось летом, во время инициированных гражданской инициативой «За свободу вероисповеданий» общественных обсуждений закона. Юристы, историки, теологи, священники постатейно доказывали: закон этот противоречит не только Конституции, гарантирующей каждому гражданину право свободно, открыто, индивидуально или вместе с другими гражданами осуществлять свою религиозную деятельность, но и внутренним укладам и канонам самих религий.

Отныне запрещено осуществлять религиозные обряды в частных домах и без зарегистрированной по месту жительства общины – вот и выпали из легальной жизни протестанты, практикующие совместные домашние моления. Общину зарегистрируют при наличии в ней не менее двадцати верующих – иудеи не вписываются: их общины – миньяны – существуют уже при наличии десяти человек. Из десяти общин складывается религиозное объединение – и только оно может издавать печатную продукцию (которая, кстати, подлежит теперь обязательной цензуре), основывать миссии.

Руководителем религиозного объединения не может быть иностранец. Вот и католики отсеклись – миссии у них назначаются Папой Римским. Для того, чтобы создать объединение, общины должны просуществовать в Беларуси не менее двадцати лет. Временной и численный цензы станут еще одной причиной, из-за которой некоторые новые для нашей страны религии, например кришнаитская, – по молодости и немногочисленности своей вообще не имеют шансов легализироваться.

А еще звучало летом предупреждение Комитета госбезопасности Беларуси. Дескать, принятие закона в таком виде может вызвать дестабилизацию в белорусском обществе. Хотя официального заключения КГБ ни депутаты, ни представители гражданской инициативы «За свободу вероисповедания» так и не увидели. О том, что этот документ в действительности существует, сообщил на летней сессии нижней палаты экс-глава комитета депутат Егоров. Ему виднее, он сам когда-то руководил этой спецслужбой.

Документ от КГБ не увидели, предупреждений не услышали. Но, честно говоря, иного результата, похоже, никто и не ожидал. Обсуждение и принятие закона, по словам небезызвестного депутата Пашкевича, сопровождалось жестким прессингом, с чуть ли ни покабинетным обходом, на депутатов и сенаторов с двух сторон – вышестоящей властью и верхушкой Русской православной церкви. И то, что закон все-таки принят именно в таком варианте, по мнению депутата, стало всего лишь еще одним и полностью логичным шагом по усилению власти президента.

Хотя, казалось, куда уж больше? У Александра Григорьевича уже есть свой собственный карманный парламент, свои собственные карманные суды, карманные газеты, а теперь вот будет свой собственный карманный бог. Именем которого, можно не сомневаться, будут освящаться очередные предприятия А. Г.

Ни для кого не секрет, как хорошо дружат белорусский президент и православная верхушка – на всех «*дажынках*» и базарах Александр и Филарет рядом. Теперь эта дружба – в законе. Церковь (русская православная), по сути, становится еще одной ветвью государственной власти.

Только вот небо не становится ближе. И дружба эта о двух концах. Президент белорусский удивительно постоянен в непостоянстве. Сегодня друг – завтра наоборот. Избежать этого удавалось редким непотопляемым личностям. И в общем-то не исключено, что через какое-то время за какую-нибудь малую провинность (скажем, приход не так поделили) представителям РПЦ выйдут боком 30 законодательных сребреников.

Пока новый закон о свободе совести еще не действует. До окончательной его ратификации представители инициативы «За свободное вероисповедание» обратились к президенту Лукашенко с просьбой наложить вето. Продолжают поступать и заявления от обеспокоенных международных структур – с констатацией того, что мы и так знаем. «*Данный репрессивный закон в своем преследовании религиозных меньшинств наносит очередной удар по религиозной свободе и тем самым нарушает международно признанные стандарты в отрасли прав человека*», – заявил на днях сопредседатель Хельсинкской комиссии США Кристофер Смит.

А представители опальных религиозных конфессий пророчат новую волну эмиграции. Мол, не найдя Бога дома, люди пощут искать его за межой.

БАЛКАНЫ

Аварийный выход для Коштуницы

ОКСАНА КУЗЬМИЧ

29 сентября в Сербии прошел первый тур президентских выборов. Почти 31 процент избирателей отдал предпочтение нынешнему президенту Югославии Воиславу Коштунице, а 27 с половиной — югославскому вице-премьеру Миролюбу Лабусу. Второй тур выборов состоится 13 октября.

Наиболее известные политические фигуры из числа 9 кандидатов, не прошедших во второй тур сербских выборов, – бывший начальник генерального штаба Небойша Павкович и представитель Партии сербского единства Борислав Пелевич, занявший место убитого полевого командира Аркана. Попытался податься в президенты и аксакал сербского демократического движения Вук Драшкович, запятнавший себя сотрудничеством с режимом Милошевича.

Милошевич и сам, было, собирался баллотироваться в президенты Сербии. Но этому воспротивился местный Центризбирком. Так как Слободан Милошевич избирался сербским президентом уже два раза: в 1990 и 1992 годах, а третий президентский срок запрещен конституцией. Так что участие экс-президента ограничилось поддержкой председателя Сербской радикальной партии Воислава Шешеля.

В Социалистической партии накануне выборов обозначились разброд и шатание. Милошевич рассчитывал на поддержку своего избранника однопартийцами-социалистами. Те не вняли его предложению и выдвинули собственного кандидата – известного сер-

Окончание на стр. 4 ➲

С ДРУГОГО БЕРЕГА

Колесо фортуны корпоративного мира

СЕРГЕЙ КОРОЛЬ, Филадельфия

От сумы и до тюрьмы... — пословицы, подобной этой, в американском английском пока нет. Но именно она точнее всего передает нынешнее положение еще недавно звездных имен капитализма.

За последний год экономический мир был озарен фейерверком скандалов, банкротств и исков. Стоило только улечься шуму от краха *Enron*, тогда крупнейшего банкротства в истории капитализма, как на смену ему пришел *Worldcom* – еще более громадное банкротство. За ними последовали могучий аудитор *Andersen*, мощная производственная группа *Tyco*, кабельное ТВ *Adelphia*, биотехнологическая фирма *Imclone* и сама богиня стиля и вкуса среднего класса Марта Стюарт.

Прошедшая неделя отмечена еще двумя огромными скандалами. В Техасе были предъявлены первые (до сих пор были лишь административные) уголовные обвинения по делу «Энрона». Финансовый директор Андрю Фастоу обвиняется в мошенничестве, хищении, отмывании денег и даче взяток. Ему грозит в общей сложности 147 лет заключения.

В Нью-Йорке же прокурор штата Элиот Спитцер начал расследование злоупотреблений в крупнейших инвестиционных банках мира. В вину банкам вменяется введение в заблуждение рядовых инвесторов путем публикации ложных оценок стоимости акций. Вопреки всем прецедентам, дела рассматриваются на уровне штата, хотя Спитцер собрал коалицию коллег-прокуроров со всей страны. В худшем случае, Уоллстриту грозит расчленение всей отрасли, невиданное со времен Великой Депрессии.

Поражают две особенности. Первая: внезапность перемены общественной погоды. Вчера – звезда новой экономики, сегодня – синоним мошенничества. Во-вторых, видно, насколько стала хрупка современная корпорация со всеми ее миллиардами долларов, тысячами сотрудников и политическим влиянием, если даже такая старая фирма, ыыкак *Andersen* исчезает в считанные дни. Оказывается, что-то, за что антиглобалисты боролись годами, может сделать за месяц областного ранга прокурор. Это следствие радикальных перемен в жизни корпораций в последние два десятилетия.

Окончание на стр. 4-5 ➲

АНЕКДОТ-С

– Что унаследовала Германия от Маркса?

– Восточная – «Манифест», Западная – «Капитал».

***

– А что, Саддам Хусейн теперь заместитель Александра Лукашенко?

– С чего ты это взял?

– Да вот, белорусское радио полдня говорит про Лукашенко, а остальные полдня про Хусейна.

***

– Что изменилось в РБ после распада СССР?

– Очень много. В Советском Союзе жили пятилетками: от съезда к съезду родной КПСС. В Беларуси тоже живут пятилетками: от выборов до выборов родного президента.

ХИТ-ПАРАД ГЛУПОСТИ



«Радиоактивные радары стали причиной смерти многих сотен немецких солдат»

(«Наши новости», ОНТ, 8.10.02)



«С теплом будем, а вот торговать надо учиться»

(В. Баранов, «Республика», 9.10.02)



«От долгов молоко киснет»

(В. Статкевич, «Советская Белоруссия», 9.10.02)

НАВІНЫ

Шагал. Супрацоўнікі Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі знайшлі унікальныя дакументы, датычныя малавядомага віцебскага перыяду жыцця Марка Шагала. Новыя старонкі біяграфіі мастака адкрываюць школьныя працы і класны журнал, якія цягам ста гадоў захоўваліся ў фондах Віцебскай гарадской вучэльні. Паводле супрацоўнікаў Нацыянальнага архіва, «тройка» была самай высокай адзнакай па маляванні будучага сусветна вядомага майстра жывапісу.

Інтэграцыя. 23 лістапада ў Мінску адбудзецца міжнародная канферэнцыя «Беларусь – Расія: новая інтэграцыя». Арганізатарам яе выступіў аналітычны цэнтр «Стратэгія» з удзелам Маскоўскага прадстаўніцтва Фонда Макартураў. Як паведаміў прэзідэнт цэнтра Леанід Заіка, тэма і фармат сустрэчы, прадстаўніцтва ўдзельнікаў абумоўлены змяненнямі беларуска-расійскай інтэграцыі, трансфармацыяй поглядаў Захада на яе развіццё. Мэта канферэнцыі — паспрабаваць знайсці адказы на пытанні: што адбываецца з інтэграцыяй, які кошт збліжэння дзвюх дзяржаў і дзе крайняя мяжа гэтага збліжэння. Плануецца, што на канферэнцыю ў Мінск прыедуць лідэр Саюза правых сіл Расіі Барыс Нямцоў, старшыня Камітэта па міжнародных справах Дзяржаўнай думы РФ Дзмітрый Рагозін, вядомыя расійскія палітолагі і эканамісты.

Беспрацоўе. З пачатку года афіцыйнае беспрацоўе ў Беларусі выросла на 11,3 адсотка, а параўнальна з аналагічным перыядам мінулага года – на 20 адсоткаў. Змушаная няпоўная занятасць толькі за 7 месяцаў бягучага года ахапіла больш за 431 тысячу чалавек.

Паек. У Міністэрстве абароны распрацаваны новы агульнавайсковы паёк. Паводле харчовай службы тылу Узброеных сілаў, па калярыйнасці ён пераўзыходзіць цяперашні. Другой перавагай новага пайка ёсць склад яго з прадукцый айчынных вытворцаў, што дае кухарам большую свабоду выбару пры гатаванні страваў. З улікам гэтага ў ваенным ведамстве абмяркоўваюць магчымасць арганізаваць харчаванне вайскоўцаў тэрміновай службы з прыцягненнем грамадскіх службаў і адмысловых. Новы паёк плануецца ўвесці з 1 студзеня 2003 года.


Заробкі. У Беларусі запазычанасць па заробках перавысіла 100 мільярдаў рублёў. Праблему ліквідавання запазычанасці ў панядзелак разглядаў урад краіны. Нараду па гэтым пытанні праводзіў першы намеснік прэм'ер-міністра Сяргей Сідорскі. У час нарады было адзначана, што на сёння запазычанасць па заробках складае больш за 19 адсоткаў ад агульнага фонду заработнай платы.

Адхіленне. Намеснік міністра ўнутраных спраў Леанід Глухоўскі адхілены ад выканання сваіх абавязкаў. Гэты захад стаў вынікам справаздачы прэзідэнту Лукашэнку кіраўнікоў сілавых структураў краіны. Разам з Глухоўскім ад выканання абавязкаў з фармулёўкай *«за неналежную арганізацыю расследавання крымінальных справаў па фактах праваапарушэнняў на цэлюлозна-папяровай прамысловасці Гомельскай вобласці»* адхілены і начальнік управы Камітэта па барацьбе з арганізаванай злачыннасцю вобласці Уладзімер Карцаў. А. Лукашэнка абураўся фактамі лабіявання інтарэсаў камерцыйных фірмаў асобнымі супрацоўнікамі праваахоўных органаў.

Хабар. Чыноўнік Мінфіна затрыманы падчас атрымання хабару. Намесніку начальніка ўправы рэвізіяў Галоўнага кантрольна-рэвізійнага ўпраўлення Мінфіна Юр'ю Раку давалі хабар 6000 *USD*. Затрыманне праведзена ў нядзелю супрацоўнікамі Дэпартамента фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржкантролю.

Указ. Змагацца з карупцыяй будуць яшчэ больш жорстка. А. Лукашэнка падпісаў указ пра зацвярджэнне новай праграмы па ўзмацненні барацьбы з карупцыяй на 2002–2006 гады, якая прадугледжвае новы комплекс антыкарупцыйных захадаў. Паведамляецца, што мэтай праграмы ёсць забеспячэнне канстытуцыйнага прынцыпу вяршэнства права ды рэалізацыя перадвыбарчых абяцанняў цяперашняга кіраўніка дзяржавы.

Кірмаш. Яшчэ год будзе працаваць кірмаш на сталічным стадыёне «Трактар». Разам з тым, у планах гарадскіх уладаў яго закрыццё. Тое ж самае пагражае і кірмашу «Байкальскі» – на ягоным месцы будзе пракладзеная дарога. Прадпрымальнікам будзе прапанавана арандаваць месцы ў крытых установах гандлю. Натуральна, у такім разе паўстануць больш высокія кошты, чым на зліквідаваных рынках.



«Пагоня». Час з 5 да 9 кастрычніка Мікола Маркевіч правёў у сям'і: адміністрацыя Асіповіцкай спецустановы адпусціла рэдактара «Пагоні» дадому. Маркевіч мусіў заслужыць гэткі «дарунак», правёўшы месяц на «хіміі» і уладкаваўшыся на працу.

Пасрэднік. Сваё пасрэдніцтва ва ўрэгуляванні крызісу вакол Іраку прапанаваў прэзідэнт Лукашэнка. Такую заяву кіраўнік Беларусі зрабіў у Кішынёве падчас працы саміту СНД. Аляксандар Лукашэнка выказаўся супраць нанясення ўдараў па Іраку, назваўшы такое развіццё падзеяў *«бесперспектыўным шляхам»*. Саміт прайшоў за зачыненымі дзвярыма без прысутнасці прэсы. Паведамляецца, што А. Лукашэнка ды Ул. Пуцін дасягнулі дамоўленасці пра пашырэнне складу камісіі, якая працуе над падрыхтоўкай Канстытуцыйнага акту Саюзнай дзяржавы.

ВОСЬ ТАК

Хатка і яе руплівец

ЮРАСЬ ЗЯНКОВІЧ

8 кастрычніка на сядзібе Партыі БНФ адбылася прэсавая канфэрэнцыя вядомага майстра-рэстаўратара беларускіх музычных інструмантаў Уладзімера Пузыні.

Прэс-канфэрэнцыя была скліканая з нагоды звальненьня знакамітага майстра з Унівэрсытэту культуры. Падтрымаць калегу прыйшлі вядомыя дзеячы, сярод якіх былі старшыня Згуртаваньня беларусаў сьвету прафэсар Анатоль Грыцкевіч, старшыня Партыі БНФ філёляг Вінцук Вячорка, старшыня выканкама АСДП Аляксей Кароль.

Уладзімер Пузыня – стваральнік знакамітай майстэрні беларускіх музычных інструмантаў «Беларуская хатка», якая існуе ўжо больш за 20 год. За гэты час пад кіраўніцтвам майстра былі адрамантаваныя і ўдасканаленыя дзясяткі інструмантаў, якія ўжываюцца ў розных аркестрах у Беларусі і па-за яе межамі. Уладзімер Пузыня – адзіны ў краіне мае кваліфікацыю майстра-рэстаўратара вышэйшай катэгорыі.

«Беларуская хатка» існуе пры Ўнівэрсытэце культуры. Відаць, камусьці з кіраўніцтва вельмі не спадабалася вальнадумства майстра, і з канца мінулага году на Ўладзімера Пузыню пачалі ажыццяўляць планамерны ціск з мэтаю змусіць яго добраахвотна сысьці з працы. Гэтак, яму некалькі месяцаў не выплочвалі заробак, аргументуючы гэта тым, што няма доказаў, што ён быў на працы.

Улетку яго перавялі на палову стаўкі, пазбавіўшы выкладчыцкай працы са студэнтамі. І ўрэшце яму адкрытым тэкстам запрапанавалі напісаць заяву «па ўласным жаданьні», пагражаючы, што ў адваротным выпадку ён усё адно будзе звольнены. Нядаўна Ўладзімер Пузыня быў азнаёмлены з паперай, што памяшканьне яго майстэрні (натуральна, з усёй калекцыяй прыладаў працы і гатовых інструмантаў) належыць перадаць унівэрсытэту ў сувязі з тым, што там не хапае памяшканьняў для заняткаў. А само існаваньне «Беларускай хаткі» на працягу 20 год было названае *«нелегальным»*, і цяпер яе, маўляў, такім чынам трэба легалізаваць.

Сам майстар на поўным сур'ёзе разважае пра магчымасьць сваігo ад'езду за мяжу, бо, на ягоную думку, у Беларусі ён ня знойдзе працы. Пра прычыны ціску на яго ён сказаў: *«Я – беларус, я цярплю за сваю ідэю, за сваіх нашчадкаў»*.

Відаць, нягледзячы на зьмену рыторыкі рэжыму на пранезалежніцкую, сутнасьць яго засталася тая самая: беларусам няма месца на гэтай зямлі, і выдатныя дзеячы беларускай культуры адзін за адным «выціскаюцца» па-за межы краіны. ■

КАНГРЭС

«Трэці сектар» – за незалежнасць

5–6 кастрычніка ў Мінску адбыўся IV кангрэс Асамблеі няўрадавых дэмакратычных арганізацыяў Беларусі. У ім узялі ўдзел каля 200 дэлегатаў, а таксама госці з Украіны, Польшчы, Галандыі, Даніі. Але не ўсе запрошаныя замежнікі патрапілі на кангрэс. Некаторым беларускі бок візы не выдаў. Статус-кво захаваўся: «трэці сектар» па-ранейшаму ў апале.

У сваім выступе старшыня рабочай групы Асамблеі Алесь Бяляцкі адзначыў: жорскае супрацьстаянне паміж рэжымам і недзяржаўнымі аб'яднаннямі цягнецца ўжо не першы год, але ціск асабліва ўзмацніўся з часу мінулагодніх прэзідэнцкіх выбараў, калі на грамадскіх актывістаў абрынуліся рэпрэсіі, пачалося закрыццё арганізацый. У такіх умовах, адзначыў Алесь Бяляцкі, на Асамблею ўскладаюцца надзеі як на структуру, якая здольная абараняць інтарэсы недзяржаўных аб'яднанняў.

Была створана таксама ініцыятыўная група па ўдасканаленні працы Асамблеі, на старонках яе «Бюлетэня» вырашана распачаць дыскусію па гэтым пытанні.

Яскрава сведчыць пра адносіны ўладаў да «трэцяга сектара» і непрызнанне ўладамі Асамблеі, якую да гэтага часу не зарэгістравалі. Міністэрства юстыцыі нават не зрабіла ласку адказаць на пададзеныя дакументы. Удзельнікі канферэнцыі вырашылі не здавацца і накіраваць прэтэнзіі ў адпаведныя органы з патрабаваннем рэгістрацыі.

Гарачая дыскусія разгарэлася па спрадвечнай дылеме: «НДА і палітыка», ці «карэктна» грамадскім аб'яднанням ублытвацца ў справы палітыкі. У выніку паразумеліся, што рашэнне пра ўдзел у вясновай выбарчай кампаніі кожная арганізацыя пакідае за сабой.

Прыемным момантам канферэнцыі сталася падвядзенне вынікаў конкурсаў «Лепшы выкананы праект» і «Лепшая ідэя» і адпаведнае ўзнагароджанне граматамі і прызамі. Пераможцам першага стала ГА «Дыярыуш» (за конкурс па гісторыі для школьнікаў «Мой радавод»), другога – Беларуская асацыяцыя сацыяльных работнікаў (за стварэнне сеткі бюро сацыяльнай інфармацыі).

Кангрэс Асамблеі прыняў таксама заяву «У абарону незалежнасці Беларусі». ■

ПАРТИЙНАЯ ЖИЗНЬ

СУДЬЯ ИЗ СОЛИГОРСКА МЕТИТ В КНИГУ ГИННЕССА

ПАВЕЛ ВЛАДИМИРОВ, пресс-служба ОГП

Рекорд, поставленный 7 октября в Солигорске простой белорусской женщиной, судьей городского суда Оксаной Коледой, поистине достоин книги рекордов Гиннесса.

Солигорская служительница Фемиды умудрилась по делу об административном правонарушении (которого, как стало уже доброй традицией в Беларуси, скорее не было, чем было) вынести такое решение, аналогов коему не сыскать в анналах мировой и отечественной юриспруденции. Одному из обвиняемых придется заплатить штраф в 150 минимальных заработных плат, что составляет 2 миллиона 550 тысяч белорусских рублей, или примерно, 1380 долларов США! Причем, что самое интересное, этого человека даже свидетели-милиционеры не смогли назвать активным участником «несанкционированного мероприятия».

История этого беспрецедентного штрафа началась 21 августа, когда в шахтерский город приехали председатель Объединенной гражданской партии Анатолий Лебедько и член политсовета ОГП Людмила Грязнова для встречи со своими сторонниками. Однако буквально за несколько часов до мероприятия им было отказано в предоставлении заранее арендованного и оплаченного помещения столовой. Руководители точки общепита даже не скрывали, что поступить так их заставил страх перед городским начальством. Тогда организаторы встречи и гости – всего около 40 человек – решили пообщаться на свежем воздухе и переместились на близлежащий стадион.

Спустя несколько минут к ним подъехал исполняющий обязанности начальника солигорской милиции подполковник Адам Кривальцевич. Собравшимся было предложено немедленно разойтись под угрозой вызова наряда и силового разгона. Пришлось почти полчаса потратить на объяснения. Мотивация требований милицейского офицера была довольно своеобразной: дескать, нарушается декрет президента, хотя каким образом и кем именно – сформулировать не сумел. Просто сказал, что *«здесь говорят о политике»*.

Милицейский «уазик» с нарядом вскоре действительно подъехал. Подоспели и «кинематографисты в штатском» с видеокамерой. Тем не менее, все закончилось идиллически мирно: милиционеры подсели на скамейки и с неподдельным интересом прослушали выступления Лебедько и Грязновой. На том и расстались.

Через несколько дней на нескольких участников встречи были составлены милицейские протоколы. И вот теперь на их основании вынесено судебное решение. Согласно ему, административное дело в отношении председателя Солигорской городской организации ОГП Ларисы Насанович было отправлено на доследование, а профсоюзному лидеру Виктору Бабаеду, ответившему на несколько вопросов собравшихся на стадионе, придется заплатить штраф в 20 минималок. Но самое рекордное наказание в без малого полторы «штуки» баксов настигло председателя областного отделения Белорусского Хельсинкского комитета Леонида Мархотко, который, как утверждали на суде даже милиционеры, все время просидел на лавочке и молчал как мышь под веником.

Участники процесса, утратившие в момент оглашения вердикта дар речи, когда пришли в себя, припомнили, что мадам Коледа даже не потрудилась выдержать паузу между последним словом обвиняемых и своим приговором. Видно, ее в тот миг озарило вдохновение: нанести наконец решающий удар по изрядно надоевшему солигорской «вертикали» правозащитнику. Что ж, надо думать, градоначальники по достоинству оценили рекордный спурт судьи-новатора. ■

ПРАВІНЦЫЯ

Салідарнасць

Мастоўскія прадпрымальнікі падтрымалі агульнарэспубліканскую забастоўку, якая мае доўжыцца адзін месяц.

У аднаразавых страйкавых акцыях мастоўцы, якія працуюць на базары, удзельнічаюць даўно. Упершыню да іх падключыліся ўладальнікі камерцыйных крамаў. Але яны падтрымалі гэтую акцыю толькі тры дні. Такое рашэнне было прынята мясцовымі прадпрымальнікамі самастойна. Напярэдадні 29 верасня на гарадскім рынку сярод прадпрымальнікаў адбыўся дыспут, арганізаваны мастоўскай суполкай Аб'яднанай сацыял-дэмакратычнай партыі, дзе абмяркоўваліся пытанні іх працы ў цяперашніх умовах. У дыспуце ўдзельнічалі 86 прадпрымальнікаў, большасць з іх складалі жанчыны. У ходзе гутаркі былі ўзняты праблемы не толькі касавых апаратаў і выплатаў у сацстрах, але і самых умоваў працы і іншыя пытанні. Пад- час правядзення дыспуту ўзнікла пытанне аб'яднання прадпрымальнікаў Мастоўшчыны, і яно было амаль аднагалосна падтрымана. 51 чалавек увайшоў у арганізацыйны камітэт па стварэнню гэтага аб'яднання. ■

СОЦИОЛОГИЯ

ХРИСТИАНИЗАЦИЯ ПЛЮС СЕКУЛЯРИЗАЦИЯ

АЛЕКСЕЙ МАКОВЕЦ

В сентябрьском опросе общественного мнения НИСЭПИ поинтересовался у респондентов их религиозной ориентацией. 1509 человек от 18 и старше подверглись опросу методом *face-to-face interview*. Оказалось, большинство белорусов православному атеизму предпочло равенство религиозных конфессий.

Отрадные, на первый взгляд, итоги дал опрос НИСЭПИ по вопросам вероисповедальным. К завершению года 2002 от Рождества Христова на девять верующих у нас приходится всего один неверующий или атеист.

Кто-то определился с конфессиями-церквями, кто-то за христианство без подробностей. Приросло число верующих православными. За каких-то полтора года прибавилось десять процентов. Католики тоже не отстают. А протестантов, хоть и мало пока, с апреля 2001 стало вдвое более прежнего. Агностиков убавилось наполовину. Иудеев с мусульманами – теперь один на тысячу. Так мы ж почти поголовно христианская страна!

Но и у христиан, как известно из истории религиозных войн, не во всем царят мир да согласие. У нас расколами не пахнет, хотя повод, в принципе, уже заготовлен. Принята новая редакция закона «О свободе вероисповеданий и религиозных организациях». За православной церковью в Беларуси закрепили роль ведущую и направляющую. Патриарший экзарх всея Беларуси митрополит Минский и Слуцкий Филарет не возражал.

А вот как звучал в сентябре глас народа Беларуси. Сравним результаты таблиц 1 и 2. Только половина белорусских православных страждет привилегий. А судя по диаграмме, две трети всех респондентов – за равную свободу совести. Против союза православной церкви с белорусским государством половина самих православных. Но четверо белорусских православных из десяти – за свободу совести с привилегиями. Есть чему радоваться, официально православие теперь государственная религия. Есть, конечно, и оговорки.

Пока православизация Беларуси поддерживалась государством в русле интеграционной кампании. Белорусский экзархат подчинен РПЦ, и вряд ли слово белорусского президента перевесит слово московского патриарха. Смена курса с интеграции на суверенизацию, даже при государственном статусе, не превратит Русскую православную церковь в белорусскую.

По большому счету, ни РПЦ, ни Александр Лукашенко, ни белорусские православные ничего серьезного не приобрели. Принцип «чья власть – того и вера» в белорусском исполнении серьезных гарантий православию не дает. Власть белорусская давно уже определила свое религиозное кредо как *«православный атеизм»*. Яснее выражаясь – безбожие с политическим реверансом в сторону московской ортодоксии.

Союз с атеизмом, ряженым под византийско-московское благочестие, не повысит авторитет РПЦ в Беларуси. Хотя и не убавит существенно. Большинство белорусских верующих четко различает, где кесарево, а где богово. Так что верующие останутся при своих моральных понятиях, а князья мира сего – при своих политических интересах.

Как показал опрос НИСЭПИ, рехристианизация постсоветской Беларуси сопряжена с секуляризацией. Вчерашние атеисты и агностики уже пережили атеизм в качестве государственной религии. И в явном большинстве своем голосуют за свободу совести. Поэтому попытка укрепить светскую власть в Беларуси через московское православие легитимности ей не прибавит. ■



Таблица 1. Распределение ответов на вопрос "Ваше вероисповедание?", % (открытый вопрос)		
Вариант ответа	**04'01**	**09'02**
Православный	58,9	67,4
Католик	9,8	13,1
Христианин	11,8	7,4
Атеист	5,1	4,9
Неверующий	0,6	1,0
Протестант	0,3	0,6
Иудей	-	0,1
Мусульманин	-	0,1
НО	13,4	5,6

Таблица 2. Отношение к равенству конфессий в зависимости от вероисповедания*, %

Вариант ответа	Отношение к поправкам в закон о религии, утверждающим ведущую роль православной церкви в Беларуси		
	Православная церковь должна иметь преимущества перед другими	Все церкви у нас должны иметь равные права	ЗО/НО
Православный	41,4	51,7	6,9
Католик	8,6	84,3	7,1
Христианин	33,3	59,5	7,2
Атеист	8,2	63,0	28,8
Неверующий	14,3	50,0	35,7
Протестант	11,1	88,9	—
Иудей	—	100	—
Мусульманин	—	100	—
НО	26,2	58,3	15,5

* Таблица читается по горизонтали, например, среди тех, кто по вероисповеданию являются католиками, 84,3% считают, что все церкви должны иметь равные права

ПАРТЫІ



БНФ: ракіроўка ці раскол?

АЛЕСЯ ГОРДЗІНА

5 кастрычніка ў БНФ адбылася ратацыя кадраў — пераабранне кіраўніка Мінскай абласной арганізацыі. Сённяшнюю сітуацыю ў Фронце некаторыя СМІ ужо ахрысцілі як новы раскол.

Падбухторшчыкам скандалу стаўся старшыня абласнога БНФ Валянцін Баранаў, які выказаў недавер кіраўніцтву партыі і асабіста Вінцуку Вячорку. Да сябраў партыі былі адрасаваныя і адпаведныя звароты, дзе паплечнікам прапанавалася выказацца па гэтым пытанні. Пакуль усё адбывалася ў рамках «дыскусіі», парушальніка спакою цярпелі. Апошняй кропляй стала яго нядаўняе інтэрв'ю *«Белорусской газете»*, калі ўнутраныя разборкі выйшлі па-за сцены партыі. У ім Баранаў кажа пра карупцыю ў палітычных партыях і пра знікненні грошай грантадаўцаў. *«Адкуль тады ў нашага лідэра сродкі на сотавы тэлефон, ноутбук, пастаянны інтэрнэт?* – пытаецца ён. – *А гэта ж толькі тое, што кожны з нас бачыць сваімі вачамі. А ўжо чуткі якія ходзяць!»* Пасля гэтага Управа БНФ і адпаведная абласная арганізацыя тэрмінова прынялі рашэнне склікаць Мінскую абласную канферэнцыю грамадскага аб'яднання БНФ «Адраджэньне» і Партыі БНФ. У парадку дня значылася адно пытанне: пра кіраўніка ўзгаданых арганізацый.

22 галасамі «за» (супраць – 1, устрымаўся – 1) дэлегаты выбралі новага лідэра. Ім стаў намеснік Баранава 27-гадовы Алесь Міхалевіч – выпускнік юрфака БДУ па спецыяльнасці паліталогія. У свой час ён узначальваў Задзіночанне беларускіх студэнтаў і Моладзевы інфармацыйны цэнтр, зараз – намеснік старшыні МІЦ. Спадар Баранаў на канферэнцыю не з'явіўся.

Паводле словаў новага кіраўніка, скандал яго папярэдніку па- трэбны быў, каб гучна сысці з пасады.

– *Уся справа ў тым, што Валянцін Баранаў проста страціў падтрымку мясцовых арганізацый і рыхтуе для сябе магчымасць сысці з партыі, паказаўшы, што ён з'яўляецца палітычным іншадумцам. Гэта мае асабістае тлумачэнне яго паводзінаў,* – кажа Алесь Міхалевіч. – *Спадару Валянціну было прапанавана Управай партыі БНФ прадставіць доказы аб злоўжываннях, калі яны ў яго ёсць, у рэвізійную камісію партыі БНФ. Зразумела, што нічога не было прад'яўлена. Спадар Валянцін сказаў, што ў яго ніякіх дакументаў няма, што гэтыя абвінавачанні грунтуюцца на нейкіх асабістых падозраннях. У «БГ» зноў-такі абсалютна ніякіх фактаў гэты чалавек не прыводзіць, і ўсё, што ён гаворыць, грунтуецца толькі на чутках.*

Не абышлося і без версіі «следу спецслужбаў». Некаторыя лічаць, што Баранава выкарысталі ў чарговай спробе па разбурэнні партыі. Тым больш, свежы прыклад з партыяй жанчын «На- дзея», калі ініцыятары правялі з'езд і абралі новае кіраўніцтва. Цепер як бы існуе дзве «Надзеі». Адна – апазіцыйная, другая – лаяльная да ўладаў.

Дарэчы, як паведамілі ў БНФ, Валянцін Баранаў таксама заклікаў стварыць альтэрнатыўны аргкамітэт правядзення з'езда. *«Гэта ўжо з'яўляецца нестатутнымі дзеяннямі* – патлумачыў Алесь Міхалевіч. – *У партыі БНФ ёсць працэдура склікання надзвычайнага з'езда, за які павінны выказацца больш за 1/3 мясцовых структураў партыі. Ёсць магчымасць прызначэння надзвычайнага з'езда Соймам. Але Валянцін Баранаў ні разу не выносіў гэтага пытання на абмеркаванне Сойма».*

Сам віноўнік скандалу канферэнцыю не прызнае правамоцнай. Паводле яго словаў, яна была склікана з парушеннем статута і на ёй не было кворуму. Усё, што адбылося, спадар Валянцін называе *«зачысткай»* кадраў у БНФ *«Такая зачыстка адбылася ў Гародні з Міколам Баўсюком, з Анатолем Фёдаравым у Магілёўскай вобласці,* – кажа Баранаў. – *Калі Вячорка і яго атачэнне і далей будуць парушаць статут, я вымушаны буду звярнуцца ў Міністэрства юстыцыі, іншага кроку я не бачу. Я і іншыя, хто прытрымліваецца той жа пазіцыі, можам зрабіць нават нейкі сход, сабраць чалавек 200 і абвесціць, што Вячорка ўжо не старшыня партыі. Ён і яго прыхільнікі заняты не справай барацьбы з рэжымам, а разборкамі з сябрамі партыі, якія ім не падабаюцца».*

На пытанне ўдакладніць, у якіх фінансавых махінацыях сп. Баранаў абвінавачвае сп. Вячорку, Валянцін Фёдаравіч яснасці не ўнёс: *«Гаворка ідзе аб тым, што праца ў апазіцыі дае, відаць, неблагі фінансавы капітал,*– сказаў Валянцін Баранаў. – *А не тое, што Вячорка скраў, скажам, 5 ці 10 тысяч даляраў. Такога няма. Галоўнае, гаворка ідзе пра тое, што Фронта як партыі фактычна не бачна. Крытыка ў тым, што Вячорка за ўсе гады, што на пасадзе кіраўніка БНФ, мне як абласному старшыні нічым не дапамог, ён ніколі не пагаварыў са мной шчыра аб тым, якія праблемы існуюць, у якім раёне што трэба зрабіць. Ніякай дапамогі ад Вячоркі не было».* Яшчэ адна прэтэнзія спадара Баранава – яму не даюць на рукі пячаткі яго арганізацыі.

Адметна аднак, што ні Алесь Міхалевіч, ні Валянцін Баранаў не расцэньваюць сітуацыю ў партыі як раскол. Яны кажуць, што канфлікт палягае ў асобах, у тым, хто будзе кіраваць Фронтам, а не ў ідэалагічных разыходжаннях. Але гэтым адзінадушша старога і новага лідэра вычэрпваецца. *«Вынікі галасавання гавораць самі за сябе,* – зазначае Алесь. – *Абсалютнай большасцю пры адным супраць я быў абраны старшынёй абласной арганізацыі»*. І Валянцін Баранаў у гутарцы з намі заявіў, што па-ранейшаму з'яўляецца старшынёй Мінскай абласной арганізацыі БНФ і не збіраецца складаць з сябе паўнамоцтвы. *«Калі і далей усё будзе адбывацца не паводле статута, тады прабачце. Будзем шукаць іншыя метады і формы працы»,* – папярэдзіў ён сваіх паплечнікаў-апанентаў.

Працяг будзе?

ПАДРАБЯЗНАСЬЦІ

Творчы шлях Алеся Пашкевіча

ЗЬМІЦЕР СЕРАБРАКОЎ

Нашы чытачы з Наваполацку цікавяцца, якія кніжкі напісаў нядаўна абраны старшынём Саюзу пісьменьнікаў Алесь Пашкевіч. Сапраўды, каб стаць беларускім пісьменьнікам, трэба напісаць і выдаць дзьве кніжкі, а каб стаць галоўным пісьменьнікам, напэўна, яшчэ больш.

Алесь Пашкевіч напісаў тры кніжкі. Першую зь іх – вершы пад тытулам «Нябесныя сэрвэнты» – ён выдаў у 1994, а дзьве другія зусім нядаўна, у 2001 годзе. Гэта «Пляц волі» – *«раман-дакумэнт»*, кніга гісторыка-публіцыстычнай прозы ў выдавецтве «Беллітфонд», і «Зваротныя дарогі» – збор крытычных артыкулаў, тэма якіх – проза беларускай эміграцыі XX стагоддзя. Кніга выйшла ў Беластоку ў выданьні Беларускага літаратурнага аб'яднаньня.

Героі «Пляцу волі» – гістарычныя асобы, якім не пашчасьціла ў свой час увайсьці ў пантэон герояў, бо яны па тых ці іншых прычынах займаліся не зусім законнай дзейнасьцю. Відавочна, што тэрмін даўнасьці злачынстваў паплечнікаў Булака-Балаховіча мінуў, і ягоны як вайсковы, так і палітычны вопыт можа быць карысным у наш складаны час. І хаця героі нарысаў агучваюць рэальныя гістарычныя дакумэнты, але яны не выглядаюць як васкавыя фігуры з музэя – пісьменьнік, наколькі яму падказвае інтуіцыя ці ўласны вопыт, малюе карціны быту гістарычных асобаў, каб зрабіць іх бліжэй чытачу:

«Выпілі. І Алесь адчуў разняволенасць...

– За доўгае жыццё незалежнай Беларусі, каб заціхлі хутчэй гарматы і толькі песні нашы гучалі...

Балаховіч не прыкусваў і яго адолела хмельная шчырасць:

– Добра гэта... Ото ж як добра! А мне, думаеце, шалёнства гэтае да сэрца? Ха! Ды я не веру ні Савінкаву, ні Рэйлю... У адно веру, – голас генерала загучаў цвёрда, упэўнена, – успыхне падчас майго наступу на Беларусі паўстанне! Не можа спаць народ!» (Можа! І яшчэ як! – З. С.)



Па ступені лінейнасьці падачы матэрыялу і няхітрай стылістыцы апавяданьня кніга нагадвае падручнік для чацьвёртай клясы «Апавяданьні па гісторыі СССР», з той розьніцай, што замест Суворава і Марата Казея там выступаюць Булак-Балаховіч і старшыня Беларускай цэнтральнай рады Радаслаў Астроўскі.

Найбольш узьнёслыя дыфірамбы «Зваротных дарог» прысьвечаныя легендарнаму Вацлаву Ластоўскаму, хаця сярод герояў кнігі і Юрка Віцьбіч, і Кастусь Акула. У гістарычнай прозе, на думку аўтара, Вацлаў Ластоўскі шмат у чым *«апярэдзіў Умбэрта Эка»*, а слоўнік Ластоўскага бліжэй да «Хазарскага слоўніка» Павіча, чым да руска-беларускага слоўніка Кандрата Крапівы.

Што ж, як казаў адзін з герояў Павіча: «*Intentia tua grata et accepta est Creatori, sed opera tua non sunts accepta...*» – намеры твае ўгодныя Госпаду. Сапраўды, кніга закранае кардынальныя (бо ідэалягічныя) праблемы беларускай літаратуры, і калі б выйшла, напрыклад, у 1994 годзе, магла б стаць паваротным пунктам у разьвіцьці літаратурнага працэсу. Сёньня сытуацыя патрабуе нечага большага, чым вяртаньне зь нябыту герояў мінуўшчыны. ■

ПОСТСАВЕЦКІЯ НАВІНЫ




Латвія. 5 кастрычніка ў гэтай краіне прайшлі парляманцкія выбары. На выбарах перамагла апазыцыйная партыя «Новая эра», якую ўзначальвае былы кіраўнік Нацыянальнага банку Латвіі Эінарсу Рэпсэ. Менавіта ягоная фракцыя, якая атрымала 26 месцаў у парляманце, будзе фармаваць новы ўрад. Партыя «Новая эра» падтрымлівае як мага больш хуткае ўступленьне краіны ў Эўрапэйскі зьвяз і НАТА. Другой па велічыні фракцыяй у парляманце сталася кааліцыя «За правы чалавека ў адзінай Латвіі» – аб'яднаньне некалькіх груповак, якія прадстаўляюць расейскамоўную меншасьць у краіне. Гэтая кааліцыя таксама падтрымлівае ідэі эўрапэйскай інтэграцыі, але выступае супраць уступленьня Латвіі ў Паўночнаатлянтычную дамову.

Азэрбайджан. 5 кастрычніка ў Баку адбылася шматтысячная дэманстрацыя апазыцыі, удзельнікі якой патрабавалі адстаўкі ўраду. Дэманстрацыя была арганізаваная шэрагам апазыцыйных партыяў: «Мусаватам», Дэмакратычнай партыяй, Партыяй нацыянальнай незалежнасьці, Народным фронтам ды інш. Калёна дэманстрантаў прайшла дзвюхгадзінным маршам па вуліцах сталіцы, пасьля чаго адбыўся мітынг. Выступоўцы запатрабавалі адмены вынікаў рэфэрэндуму 24 жніўня, падчас якога была зьмененая канстытуцыя краіны. Яны таксама абвінавацілі ўлады ў таталітарызме, парушэньні правоў чалавека, няздольнасьці *«вызваліць акупаваную тэрыторыю Нагорнага Карабаху»*. Акцыя прайшла без сутыкненьняў зь сіламі паліцыі. Паводле арганізатараў, у дэманстрацыі прыняла ўдзел некалькі дзясяткаў тысячаў чалавек. Паліцыя агучыла больш сьціплыя лічбы: па іх дадзеных, у апазыцыйным шэсьці ўдзельнічала каля 3 тысячаў чалавек.

Абхазія. Улады непрызнанай Рэспублікі Абхазія абвінавацілі грузінскія сьпецслужбы ў спробе арганізацыі тэрарыстычнага акту падчас конна-спартовага сьвята ў горадзе Гагры 4 кастрычніка. У гэты дзень Абхазія сьвяткавала дзень перамогі ў вайне з Грузіяй, якая скончылася 10 год таму. Супрацоўнікі службы бясьпекі знайшлі пад гасьцявой трыбунай іпадрому супрацьтанкавую міну. Міна была абясшкоджаная, і сьвята прайшло так, як было заплянавана.

Грузія-Расея. На мінулым тыдні ўлады Грузіі выдалі Расеі 5 з 13 чачэнскіх баевікоў, якія былі затрыманыя ў жніўні пры спробе перасекчы грузінскую мяжу, адступаючы пад націскам расейскіх жаўнераў. Гэта выклікала хвалю пратэсту ў Грузіі, асабліва ў Панкіскай цясьніне, дзе жыве вялікая колькасьць чачэнцаў, у тым ліку сваякоў экстрадаваных. Літаральна праз паўтары гадзіны пасьля таго, як самалёт з чачэнцамі ўзьляцеў з аэрапорту, у міністэрства юстыцыі Грузіі паступіла афіцыйная папера з Стразбурзкага суду па правах чалавека з просьбай часова адкласьці экстрадыцыю да таго моманту, пакуль суд не разгледзіць накіраваную да яго скаргу затрыманых. З гэтай нагоды Грузія адмовілася пакуль выдаваць Расеі астатніх 8 затрыманых.

Між тым, прэзыдэнт Расеі Ўладзімір Пуцін заявіў пасьля саміту СНД у Кішынёве, што сілавая акцыя ў адносінах да Грузіі ня будзе неабходнай у тым выпадку, калі Грузія выканае ўсе дасягнутыя на саміце дамоўленасьці, у тым ліку выдасьць чачэнскіх баевікоў. А генпракуратура Расеі скончыла праверку ў адносінах да прэзыдэнта Грузіі. Эдуарда Шэварднадзэ падазравалі ў тым, што займаючы пасаду міністра замежных справаў СССР, ён падпісаў шкодны для краіны пакт Бэйкера-Шэварднадзэ пра перадзел марской мяжы паміж СССР і ЗША у раёне Берынгавага праліву. На думку некаторых расейскіх палітыкаў, з-за гэтага пакту спачатку СССР, а цяпер Расея нясуць вялізарныя страты. Аднак генпракуратура Расеі не знайшла ў дзеяньнях Шэварднадзэ складу злачынства.



